УДК 317(018)

А.Э. Крываносава

# Асноўныя сродкі і метады маральнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў

Новае асэнсаванне нацыянальнай сістэмы выхавання, прызначанай садзейнічаць фарміраванню асобы на глебе нацыянальнай культуры, часткай якой з'яўляецца і народная педагогіка, дало штуршок плённаму развіццю этнапедагагічных даследаванняў. Наш артыкул прысвечаны аднаму боку выхавання ў беларускай народнай педагогіцы – маральнаму, а дакладней, яго аперацыйна-дзейнаснаму кампаненту, які рэалізоўваўся праз сістэму сродкаў і метадаў.

Педагагічныя назіранні і вывады нашага народа можна знайсці ў творах вуснай народнай творчасці, у працах прагрэсіўных педагогаў, этнографаў, філосафаў, пісьменнікаў былых часоў. Літаратурная спадчына сведчыць аб тым, што народныя выхавацелі не проста марылі пра дасканалага чалавека, не проста жадалі бачыць сваіх дзяцей і ўнукаў сумленнымі і добрымі людзьмі, але і прыкладалі шмат намаганняў дзеля гэтага. "Хто дзяцей мае, няхай навучае", "Не сагнеш маладой дубіны, састарэе – пераломіцца", "Маладыя ад старых вучацца", "Дзетак узгадаваць – не курак пасклікаць", – казалі ў народзе.

Асабліва ўважліва і сур'ёзна беларусы займаліся маральным выхаваннем падрастаючага пакалення. Падобнае стаўленне было абумоўлена разуменнем таго, што чалавек мае інтэлектуальныя і фізічныя задаткі; чаго нельга сказаць пра маральны бок асобы. Маральнасць немагчыма здабыць з самога сябе. Гэтую, адну з самых галоўных характарыстык, чалавек атрымлівае толькі ў выхаванні. Таму і з'явілася ў С.Полацкага параўнанне сэрца дзіцяці з воскам, у якім адбіваюцца сляды розных уздзеянняў: з дзіцяці можна выхаваць святлалюбнага арла ці жыхара балот вяпрука, лютага ільва ці драпежнага ваўка, працавітага вала ці лянівага асла, гаўклівага сабаку ці пакорлівае ягня [1]. Гэтым тлумачыцца багацце і разнастайнасць сродкаў і метадаў маральнага выхавання, што назапашаны беларускай народнай педагогікай.

У якасці народна-педагагічных сродкаў маральнага выхавання выступалі вусная народная творчасць, грамадская думка, аўтарытэт выхавацеля, праца, гульні, цацкі, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, нацыянальныя святы, традыцыі, звычаі, абрады, танцы.

Вывучэнне педагагічнай спадчыны беларускага народа сведчыць аб тым, што як галоўны сродак і метад выхавання праз усе ўзроставыя этапы жыцця беларуса праходзіла праца. Праца і выхаванне мяжуюць з узаемавыгадным эфектам. Так, мэтанакіраваныя педагагічныя дзеянні вядуць да набыцця, замацавання, удасканалення працоўных навыкаў. А працоўная дзейнасць дае шырокія магчымасці для фарміравання і праяўлення лепшых рыс чалавечай натуры: працавітасці, настойлівасці, цярплівасці, вынослівасці, спагадлівасці, сумленнасці, пачуцця калектывізму, справядлівасці. "Праца чала-

века трымае і ўзбагачае, а гультайства псуе", "Праца не паганіць чалавека, а корміць, поіць і вучыць ", – зазначалі ў народзе. Аб дабратворным уплыве працы на маральнае станаўленне чалавечай асобы сведчыць і такі гістарычны факт: у сярэднявеччы на беларускіх землях існаваў звычай дзядзькавання, калі шляхта аддавала сваіх дзяцей на выхаванне ў сялянскія сем'і. Шырокае распаўсюджванне гэтага звычаю даказвае прызнанне заможнымі бацькамі станоўчага ўплыву сялянскага асяроддзя на развіццё шляхетных дзяцей. Лічылася, што працоўны ўклад жыцця беларускіх сялян ствараў спрыяльную выхаваўчую глебу для фізічнага і духоўнага росту дзіцячай асобы.

Не менш значным сродкам і метадам беларускай народнай педагогікі можна лічыць народныя гульні, якімі было насычана кола дзіцячых захапленняў. Прыхільнасць дзяцей да забаў народ скарыстаў у педагагічных мэтах. Каб дарослае жыццё з яго складанымі калізіямі не навалілася адразу на падлетка, беларусы праз гульні стараліся пазнаёміць дзіця з важнымі сацыяльнымі ролямі, тыповымі формамі паводзін, асноўнымі патрабаваннямі да маральнага, разумовага, фізічнага аблічча чалавека, са шматлікімі бакамі працоўнай дзейнасці.

Аналіз фальклорнага матэрыялу беларускага народа дае магчымасць сцвярджаць, што вусная народная творчасць, у якой захаваліся нацыянальны каларыт, духоўная моц і прыгажосць народа, выступала ў якасці выдатнага сродку выхавання. Зместам фальклорных твораў з'яўляецца адлюстраванне навакольнай рэчаіснасці і адначасова эмацыянальныя адносіны да яе, маральна-эстэтычная ацэнка з'яў жыцця. Прычым вусная народная творчасць – не дакладны адбітак наяўнай рэальнасці, але і позірк у будучыню, выяўленне народнага імкнення да ідэальнага. Пры ўспрыманні ідэйнага зместу ў выхаванцаў узнікалі маральныя перажыванні і невыказаныя непасрэдна ў творы асацыяцыі, праз якія і дасягаліся выхаваўчыя мэты. У вуснай народнай творчасці беларусы добра справіліся з нялёгкай задачай паднесці мараль так, каб яна ўплывала на дзіця, а не гучала знарок, дакучліва. Вывучаючы фальклорныя творы з педагагічнага пункту гледжання, цяжка аддаць перавагу якому-небудзь аднаму іх жанру, няхай гэта казкі, песні, паданні, легенды, прыказкі, прымаўкі, загадкі, калыханкі: пласты народных маральных поглядаў арганічна ўвайшлі ва ўсе віды, усе яны каштоўныя насычанасцю самабытнымі этычнымі, філасофскімі думкамі.

Трэба адзначыць, што адным з важнейшых сродкаў уздзеяння на маральнае станаўленне дзіцяці беларусы справядліва лічылі грамадскую думку, якая ў выглядзе ацэначных або дырэктыўных меркаванняў выносіла рашэнне па той ці іншай праблеме маральнага жыцця чалавека, чым дапамагала яму бязбольна для сябе і іншых будаваць узаемаадносіны з людзьмі, уключацца ў сацыяльную дзейнасць. Грамадская думка часта ўбіралася ў форму народных афарызмаў, прыказак і прымавак, якія ўспрымаліся выхаванцамі як пераканаўчае меркаванне многіх пакаленняў, і валодала рэгулятыўнай, кантрольнай сілай уздзеяння.

Вывучэнне этнаграфічных крыніц паказвае, што важным сродкам прывучэння малодшага пакалення жыць клопатамі, інтарэсамі, ідэаламі народа служылі традыцыі, звычаі, абрады. Нацыянальныя традыцыі як сацыяльна-культурны феномен выконваюць вельмі важныя функцыі. Па-першае, традыцыі аб'ядноўваюць прадстаўнікоў пэўнай этнічнай супольнасці, лучаць пакаленні людзей, дзякуючы сваёй устойлівасці і паўтаральнасці. Па-другое, традыцыі выступаюць рэгулятарамі паводзін, узаемаадносін людзей

паміж сабой, бо змяшчаюць у сабе маральна-этычныя нормы, правілы гаспадарчай дзейнасці, прынцыпы выхавання дзяцей і г.д. Традыцыі часта падмацоўваліся звычаямі – стэрэатыпнымі спосабамі паводзін у падобных, стандартных сітуацыях. У гэтым бачна вялікая мудрасць продкаў: прывычка прытрымлівацца аўтаматычных дзеянняў у стэрэатыпных, шаблонных сітуацыях вызваляла мозг для вызначэння спосабу паводзін у неардынарных умовах. "Старога звычаю не кідайся", – навучалі беларусы. Абрады як комплекс строга кананізаваных сімвалічных дзеянняў выклікалі ў іх выканаўцаў пэўныя думкі, уяўленні, пачуцці, перажыванні праз эстэтычны стыль, мастацкую форму дзеянняў. Традыцыі стаяць на больш высокай ступені абагульнення маральна-этычных патрабаванняў, а звычаі і абрады, насычаныя эмацыянальна-эстэтычнымі матывамі, складаюць дзейсны сродак данясення маральных патрабаванняў да сэрца кожнага выхаванца.

Абагульненне вынікаў даследчых экспедыцый этнографаў на рубяжы стагоддзяў, якія зафіксаваны ў адпаведных навуковых артыкулах, нарысах, дазваляе зрабіць вывад, што старажытным сродкам маральнага выхавання служылі нацыянальныя святы, якія ўяўлялі сабой тую форму сацыяльнай сувязі, дзе інтэнсіфікуюцца чалавечыя кантакты. Пад час працяглай падрыхтоўкі да святкавання людзі імкнуліся наладзіць сувязі, гармонію ў сваім асяроддзі, каб прынесці радасць блізкім, сябрам. Дарослыя, запрашаючы дзяцей і моладзь да арганізацыі і ўдзелу ў нацыянальных святах, уводзілі іх у дзівосны свет беларускіх народных песень, танцаў, гульняў, абрадаў, у чароўны свет нацыянальнай культуры і тым самым выхоўвалі пачуццё нацыянальнай самасвядомасці і гонару за свой народ, актуалізуючы сувязь асобы з гісторыяй, ідэаламі сваёй нацыі.

Вышэйапісанымі сродкамі народ забяспечваў эфектыўнасць маральнага выхавання, якое ажыццяўлялася не менш разнастайнымі метадамі. З прычыны самой сутнасці народнай педагогікі як эмпірычнага педагагічнага вопыту людзей на ўзроўні штодзённай свядомасці нельга казаць аб тэарэтычным асэнсаванні народам сістэмы выхаваўчых метадаў, паміж якімі існавала ўзаемасувязь, супадпарадкаванне. У беларускай жа этнапедагагічнай літаратуры аўтары ў асноўным падаюць народна-педагагічныя метады маральнага выхавання шляхам пералічэння і кароткага апісання некаторых з іх або шляхам разгорнутай характарыстыкі, не ставячы мэтай іх класіфікацыю. Для арыенціроўкі ў разнастайнасці спосабаў узаемазвязанай дзейнасці выхавацеляў і выхаванцаў, накіраванай на дасягненне маральнага ідэалу, мы зрабілі спробу згрупаваць іх, адштурхоўваючыся ад ужо існуючых у этнапедагогіцы варыянтаў класіфікацыі народна-педагагічных метадаў, якія адлюстроўваюць розніцу ў поглядах вучоных. Першы варыянт распрацаваны Ш.А. Мірзоевым, даследчыкам, які доўгі час займаўся праблемай сродкаў і метадаў народнай педагогікі Дагестана, і ўключае пяць груп метадаў: метады пераканання (этычная гутарка, наказ, растлумачэнне, прыклад, практыкаванне), метады прымусу (даручэнне, унушэнне, патрабаванне, асуджэнне, пакаранне), стымулюючыя метады (пахвала, заахвочванне), метады падвядзення вынікаў (іспыты), метады станоўчага эмацыянальнага ўздзеяння (прывітанне, зварот, пажаданні дабра, благаславенне, запавет) [2]. Другая класіфікацыя метадаў, на аснове вывучэння башкірскай народнай педагогікі, прапанавана В.І. Баймурзінай: метады славеснага ўздзеяння (растлумачэнне, парада, просьба, адабрэнне, угавор, дакор), метады маральнага ўздзеяння (звычаі, забарона, пагарда, папрок, праклён, благаславенне, закліананне, маленні), метады эмацыянальнага ўздзеяння (пажаданні дабра, намёкі, ускосныя пагрозы), заахвочванне і па-

каранне (усмешка, пахвала, матэрыяльнае заахвочванне, пабоі, ганьбаванне) [3]. І.А. Шораў, даследчык народнай педагогікі адыгаў, з'яўляецца аўтарам трэцяга варыянту класіфікацыі. Ён вылучае метады, якія садзейнічаюць засваенню маральных ведаў; метады, накіраваныя на фарміраванне ўменняў, навыкаў і звычак; метады эмацыянальнага замацавання адпаведных маральным нормам паводзін і стрымальнага ўплыву на адмоўныя ўчынкі чалавека [4]. Кожная з прыведзеных класіфікацый мае, на наш погляд, свае недахопы, найперш гэта няўдалае вылучэнне галоўных груп метадаў і аднясенне пэўных прыёмаў да той ці іншай групы.

Метадалагічную аснову даследавання склалі таксама фундаментальныя навуковыя працы вядучых педагогаў (Ю.К. Бабанскага, М.І. Болдырава, Д.І.Вадзінскага, Э.П. Казлова, Б.Ц. Ліхачова, Э.Л. Манасзона, І.С. Мар'енка, Л.Т. Рувінскага, І.Ф. Харламава і інш.), прысвечаныя праблемам маральнага выхавання і, у прыватнасці, пытанням выхаваўчых сродкаў і метадаў. Знаёмства з названай літаратурай дало магчымасць супаставіць класіфікацыі метадаў маральнага выхавання ў навуковай педагогіцы, выявіць частковае супадзенне поглядаў адных вучоных і зусім самастойныя, адметныя пазіцыі другіх. На наш погляд, уяўленні народа аб спосабах і шляхах уздзеяння на маральнае фарміраванне асобы лепш за ўсё ўпісваюцца ў падыход Ю.К.Бабанскага, які грунтуецца на структуры дзейнасці. Такім чынам, аналіз і абагульненне тэарэтычных распрацовак сучасных педагогаў, этнапедагагічных, этнаграфічных, фальклорных крыніц дазволілі выставіць наступную класіфікацыю народна-педагагічных метадаў і прыёмаў маральнага выхавання:

- метады фарміравання маральнага ідэалу ў свядомасці выхаванцаў: пераканание (растлумачэнне, прыклад), патрабаванне (унушэнне, парада, намёк, просьба, указанне, наказ, пажаданні дабра);

- метады арганізацыі адпаведнай нацыянальнаму і маральнаму ідэалу жыццядзейнасці: прывучэнне (паказ, растлумачэнне, гульня, праца), практыкаванне;

- метады ацэнкі і стымулявання чалавечых паводзін: заахвочванне (пахвала, адабрэнне, узнагарода); пакаранне (асуджэнне, пагроза, праклён, вымова, заўвага, ганьбаванне, цялеснае пакаранне), прыёмы стымулюючага эфекту (прыклад, клятва, благаславенне, наказ, пажаданні дабра).

З прычыны неадназначнага, узаемазамяняльнага, узаемадапаўняльнага характару метадаў народнай педагогікі мы дапускаем, што дадзеная класіфікацыя можа быць прызнана неканчатковым варыянтам.

Невялікі аб'ём работы дазваляе толькі коратка спыніцца на асноўных метадах маральнага выхавання беларускай народнай педагогікі. Беларускі педагог і этнограф М. Радзевіч слушна заўважыў: "Невуцтва ёсць складаны элемент усякага недахопу" [5, с. 213]. Каб дапамагчы дзіцяці пазбегнуць заганных учынкаў, народная педагогіка выкарыстоўвала такія метады падачы інфармацыі аб маральных нормах жыццядзейнасці чалавека, як метад патрабавання і пераканання. Кожны з гэтых метадаў рэалізоўваўся ў народзе праз шэраг выхаваўчых прыёмаў, якія забяспечвалі ўзроставы і індывідуальны падыход да выхаванцаў.

На ранніх этапах жыцця дзіцяці, калі яно не ў сілах засвоіць увесь аб'ём славеснай і нагляднай інфармацыі, выхавацелі пачыналі работу па фарміраванню свядомасці з унушэння, калі немаўля прымала на веру тое, што кажуць дарослыя, калі большую значнасць мелі не столькі сэнсавы змест, колькі яркасць, выразнасць мовы і рухаў дарослых. Арсенал выхаваўчых

сродкаў беларусаў быў насычаны ў гэты перыяд лагоднымі і задушэўнымі калыханкамі, забаўлянкамі, дзіцячымі песенькамі, якія закладвалі ядро маральнага свету маленькага чалавека. На наступным узроставым этапе да сродкаў унушэння далучаліся прыказкі, прымаўкі, традыцыі, звычаі, абрады, гульні, аўтарытэт старэйшых, якія ўкаранялі ў дзіцячай свядомасці пэўны склад думак, звяртаючыся перш за ўсё да пачуццёвай сферы дзіцяці. Патрабаванні з боку выхавацеляў падаваліся і ў форме катэгарычных імператываў, наказаў, прамых указанняў на сацыяльна і асобасна карысныя спосабы дзейнасці або недапушчальныя ўчынкі, і ў больш мяккай, ускоснай форме пажаданняў, просьбаў, намёкаў ("Кошку б'юць, а нявестцы наветкі даюць"), парад ("Слухаць добрай рады не шкодзіць").

З пашырэннем жыццёвага вопыту выхаванца, кола яго зносін і абавязкаў народным педагогам нельга было абмяжоўвацца толькі выказваннем дэкларатыўных меркаванняў аб неабходнасці тых ці іншых паводзін. Таму метад патрабавання з пасталеннем дзіцяці ўступаў месца метаду пераканання, самай галоўнай дарозе чалавечага выхавання, па словах К.Дз. Ушынскага [6]. Гэты метад дазваляў узброіць выхаванца маральнымі ведамі, выпрацаваць сацыяльна значныя адносіны да фактаў навакольнага жыцця шляхам растлумачэння. Ужываючы прыём растлумачэння, беларусы давалі дзіцяці абгрунтаваныя доказы неабходнасці і карыснасці пэўных дзеянняў, раскрывалі маральны сэнс канкрэтных учынкаў, правілаў паводзін, каб дзіця не сумнявалася ў іх разумнасці і каштоўнасці. Сродкамі дадзенага метаду былі народныя прыказкі, казкі, легенды, грамадская думка, аўтарытэт і прыклад старэйшых. Падбор, камбінаванне, растлумачэнне маральнага сэнсу дарэчных для канкрэтнай выхаваўчай сітуацыі твораў фальклору, рэальных учынкаў людзей дазвалялі сфарміраваць у выхаванцаў маральныя перакананні-веды, злучаныя з верай у іх і асобасным прыняццем, рацыянальную аснову дзейнасці асобы.

Беларускі вучоны і асветнік XVIII-XIX стст. Ян Снядзецкі, лічачы першараднай задачай выхавання фарміраванне маральных якасцей, пісаў: "Добрыя норавы павінны прывівацца маладым не толькі шляхам навучання, але і выпрацоўкай у іх прывычкі да добрых спраў..." [5, с. 164]. Каб пэўная форма паводзін стала для дзяцей натуральнай і прывычнай, трэба было першапачаткова навучыць ёй: "Не крычы, а лепш навучы", "Змаладу прывучаць трэба". Гэта значыць, у гульні, у працы або шляхам тлумачэння, наказу арганізаваць рэгулярнае выкананне дзецьмі канкрэтных дзеянняў, якія ў выніку шматлікіх паўтораў ператворацца ў звычку. Так, беларусы прывучалі дзіця з маленства да акуратнасці, ветлівасці, клапатлівых адносін да меншых і пажылых членаў сям'і, прывучалі дапамагаць бацькам па гаспадарцы.

Адпрацаваныя шляхам прывучэння, каштоўныя спосабы дзеянняў набывалі гібкасць і здольнасць пераносіцца ў новыя ўмовы дзякуючы метаду практыкавання. Ужо сама назва метаду сведчыць аб паходжанні ад слова "практыка", указвае на працэс назапашання практычнага боку маральнага вопыту. "Адзін добры вопыт важней за сем мудрых навучанняў", – заўважалі беларусы. Кіруючыся засвоенымі правіламі і сфарміраванымі прывычкамі паводзін, дзіця будавала свае ўзаемаадносіны з дарослымі і равеснікамі, паўтарала пэўныя дзеянні ў новых сітуацыях, пры іншых абставінах.

Прад'яўляючы дзецям патрабаванні, трэба было стымуляваць і ацэньваць іх выкананне. Для гэтага ў народнай педагогіцы прымяняліся метады заахвочвання і пакарання, накіраваныя на падмацаванне станоўчых дзеянняў або тармажэнне негатыўных паводзін дзіцяці. Заахвочванне ў розных сваіх

праявах было каштоўна тым, што ўмацоўвала добрыя формы паводзін, абвастрала пачуццё ўласнай годнасці, задавальнення сабой, усяляла аптымізм, упэўненасць у правільнасці выбранага рашэння, стымулявала да лепшых паводзін. Я. Корчак заўважыў: "Калі я не змагу выхаваць дзіця ласкавым словам, позіркам, усмешкай, падвядзе і цвердая рука, і рэмень..." [7]. Што датычыцца апошняга, то ў беларускай народнай педагогіцы не існуе адзінага погляду на цялеснае пакаранне. У фальклоры прасочваюцца супярэчлівыя адносіны да гэтага віду пакарання. З аднаго боку, у фальклорных творах можна сустрэць меркаванні "Матка калі б'е, то вучыць", "Розка не мука, а ўперад навука", "У маладосці не жалей сына косці, пад старасць бацьку падзякуе". З другога боку, прыказка "Не слухаешь добрых слоў – паслухаешь ліхога кія" прымушае думаць пра цялеснае пакаранне, як пра апошнюю меру ўздзеяння на асобу дзіцяці, бо "усякае пакаранне ёсць знявага, крыўда, а хіба знявага можа выхоўваць, узвышаць маральна?" [5, с. 214]. Таму беларусы, з мэтай папярэджання дрэннага дзеяння або забароны паўтору амаральнага ўчынку, выкарыстоўвалі славеснае асуджэнне і асуджэнне незадаволеным позіркам, заўвагу і папрок, пагрозу прымяніць цялеснае пакаранне і пагрозу пазбавіць некаторых здавальненняў. Пацвярджэннем таму служаць беларускія прыказкі "Не бі сабаку кіем, бо ён яшчэ больш брахаць будзе", "Ад дубцоў дурнеюць, ад слоўцаў разумнеюць". Метады ацэнкі і стымулявання ўсведамляліся народнымі педагогамі патрэбнымі і карыснымі, калі прытрымлівацца пэўнай меры ў іх прымяненні і захоўваць разумны баланс паміж пакараннем і заахвочваннем ("Не бі, не гладзь"), асцярожна маніпуліраваць словамі ("Выказанага слова да губы не вернеш", "Як брыдкае слова сказаць, лепш язык выплюнуць", "Лепш недагаварыць, чым перагаварыць").

Такім чынам, народна-педагагічны комплекс сродкаў і метадаў, якія ўплывалі на маральны рост чалавека, валодае, на наш погляд, выдатнымі якасцямі: натуральнымі гібкімі сувязямі паміж кампанентамі гэтага комплексу, узаемадзеяннем, узаемадапаўненнем, узаемапераходам, што абумоўлена адсутнасцю жорсткага падзелу функцый паміж складанымі часткамі піраміды народных сродкаў і метадаў маральнага выхавання.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. Антология педагогической мысли Древней Руси и Русского государства XIV-XVII вв. / Сост. ***С.Д. Бабишин, Б.Н. Митюров***. М., 1985. С. 343-344.
2. ***Мирзоев Ш.А.*** Народная педагогика Дагестана (Содержание, формы и методы воспитания). Махачкала, 1986. С.67-68, 94-100.
3. ***Баймурзина В.И.*** Прогрессивные традиции нравственного и трудового воспитания башкир и их использование в практике учебно-воспитательной работы: Автореф. дис...канд. пед. наук. Казань, 1992. С. 10.
4. ***Шоров И.А.*** Адыгская народная педагогика: Дис... д-ра пед. наук в виде научного доклада. Казань, 1994. С.28.
5. Антология педагогической мысли Белорусской ССР / Сост. ***Э.К. Дорошевич, М.С.Мятельский, П.С.Солнцев***. М., 1986. С.213, 164, 214.
6. Жемчужины мысли / Сост. ***А.А.Жадан***. Мн., 1991. С.382.
7. ***Корчак Я.*** Как любить ребенка: Книга о воспитании. М., 1990. С. 297.



## *S U M M A R Y*

*The author makes an attempt to classify methods of moral upbringing in the Belarussian folk pedagogy on the analysis of the leading teacher's theoretical working-outs and generalization of ethnically pedagogical, ethnographical and folklore sources.*